Сцяпан Нефідовіч



# ІХ ЯДНАЛА ДРУЖБА

г. Лунінец, 2010

**Сцяпан Нефідовіч**

# ІХ ЯДНАЛА ДРУЖБА

**г. Лунінец, 2010**

**Нефідовіч С.П.**

**Іх яднала дружба. – Лунінец, 2010. – 20 с.**

Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч – аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі і прозы, публікацый па краязнаўству і фальклору Лунінеччыны ў перыядычным друку.

Гэтая праца С.П. Нефідовіча знаёміць чытачоў з тым, як перапляталіся жыццёвыя дарогіі двух сяброў – Уладзіміра Сцепчанкі, старшыні калгаса “Новая Палессе” і Андрэя Макаёнка, народнага пісьменніка Беларусі.

*Фотаздымкі з архіва сям’і Сценпчанкаў.*

*Фота на вокладцы – будынак Любанскага сельскага Дома культуры і мемарыяльная дошка, прысвечаная А.Макаёнку і Ул. Сцепчанку. (Фота Ірыны Нефідовіч)*

## СЦЕЖКІ ДЗЯЦІНСТВА

Жыццёвыя дарогі гэтых двух людзей – Уладзіміра Сцепчанкі і Андрэя Макаёнка – сыходзіліся, разыходзіліся. І хаця яны працавалі ў зусім розных сферах, але дружба, завязаная ў дзяцінстве, іх яднала ўсе гады, на жаль, нядоўгага жыцця.



*А.Макаёнак*



*Ул. Сцепчанка*

Уладзімір Афанасьевіч і Андрэй Ягоравіч – аднагодкі, нарадзіліся ў суседніх вёсках, суадносна Махавая і Борхаў, Рагачоўскага раёна. Разам вучыліся у Шапчыцкай сямігодцы і крыху у Журавіцкай СШ. Там некалькі гадоў запар сядзелі за адной партай, дзяліліся сваімі планамі і марамі, нават пазней заляцаліся да адной і той жа дзяўчыны Дусі, якая потымі стала жонкай Сцепчанкі.

На іх долю выпала цяжкае дзяцінства.

Сцепчанка успамінаў:

- *Толькі што арганізаваліся калгасы. Існавала нестабільнасць. Выдаліся засушлівыя гады. Неўраджай. Мае бацькі – радавыя калгаснікі, аплата працы – мізэрная. Іншы раз жылі ўпрогаладзь. Выручаў агарод. Каб дапамагчы сям'і харчамі, я летам лавіў рыбу, збіраў ягады, а восенню грыбы – сушылі ў печы.*

Макаёнак, згадваючы пра дзяцінства, у “Аўтабіяграфіі” пісаў:

*“У 1932-33-34 гг. быў пастухом у калгасе. Бацька* (быў старшынёй калгаса – С.Н.) *паслаў пасвіць свіней з калгаснай фермы, бо ніхто не хацеў за так гнаць у поле іх. За дзень бывала так набегаешся, што засынаў, не даходзячы, да пасцелі. Асабліва калі прыгадаць, пасля якога сняданку выганяў на пашу свіней:*

*галадуха вымушала маці на такія кулінарныя хітрыкі, як прыгатаванне страў з лебяды, лісця ліпы, а потым – бацьвіння.*

Сцепчанка успамінаў:

- *У нас з Андрэем былі зусім розныя інтарэсы. Ён быў добрым мастаком, удалым акцёрам у школьнай мастацкай самадзейнасці. Нават сам пісаў сцэнкі. І тая цяга да мастацтва і тэатра праз гады вылілася ў здольнасць пісаць драматычныя творы, прычым самай высокай пробы.*

*А я змалку ад бацькі навучыўся майстраваць, сталярнічаць, таму пасля васьмі класаў паступіў ў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, але з трэцяга курса быў накіраваны ў ваенна-бранетанкавае вучылішча. Андрэй жа скончыў дзесяць класаў Журавіцкай СШ і праз два гады таксама трапіў у войска.*

## У ПЕКЛЕ ВАЙНЫ

Андрэя Макаёнка вайна застала на Каўказе, але ў баявыя дзеянні ўступіў толькі праз паўгода: у канцы 1941-га дывізію, у якой служыў Андрэй, дэсантам кінулі ў Крым. Малады палітрук стралковай роты Макаёнак разам з маракамі-дэсантнікамі правёў рэйд у тыл ворага пад Феадосіяй. Цяжка паранены, ён зусім выпадкова быў падабраны на полі бою, перанёс складаную аперацыю, пры гэтым з пісталетам у руцэ сілаю адстаяў у хірургаў нагу, якую яны ўжо рыхтаваліся ампутаваць. Гэтыя раны не дазволілі Макаёнку працягваць службу ў войску, ён быў дэмабілізаваны.

Цікава, што і Уладзімір Сцепчанка на пачатку вайны служыў на Каўказе. Потым былі Закаўказзе і Украінскі фронт. Два разы паранены, апошні раз у верасні 1943 года. З палаючага танка ўцалелі двое: Уладзімір і Павел Патапкін. Абгарэлы, Сцепчанка доўга лячыўся. У маі 1944-га быў камісаваны як інвалід Айчыннай вайны.

Дарэчы, аб тым, што хтосьці ўцалеў з палаючага танка, ні Сцепчанка, ні Патапкін не ведалі. І толькі пазней, праз 23 гады, Уладзімір Афанасьевіч і Павел Сяргеевіч сустрэліся зноў, ужо як баявыя сябры.

## НА ПРАЦОЎНЫМ ФРОНЦЕ

Адразу ж пасля вайны асноўныя этапы жыцця і працы Уладзіміра Афанасьевіча звязаны з развіццём і станаўленнем беларускага Палесся. З 1945 па 1959 гг. ён працаваў у райкамах і выканкамах Ганцавіцкага, Лунінецкага і былых Давыд-Гарадоцкага і Ленінскага раёнаў. У 1959 г. Сцепчанка выбіраецца старшынёй калгаса.

Андрэй Ягоравіч да кіруючых абавязкаў прыступіў раней, адразу ж пасля вызвалення Гомеля. Спачатку працуе ў Журавіцкім райкаме партыі, а пасля вучобы ў Рэспубліканскай партыйнай школе Макаёнак стаў загадчыкам аддзела прозы часопіса “Вожык”. Але няўрымслівая душа імкнулася пісаць творы сур'ёзныя, і ён пачаў пісаць п'есы, камедыі, драмы.

## ГЕРОЙ ПРАЦЫ – ГЕРОЙ П'ЕСЫ

Прыход Уладзіміра Афанасьевіча Сцепчанкі з пасады старшыні райвыканкама на пасаду старшыні адстаючай тады гаспадаркі “Сцяг камунізму” (пазней “Новае Палессе”), да якога яшчэ далучылі суседні калгас з вялікімі даўгамі, - як подзвіг. Але арганізатарскія здольнасці, уменне мысліць на перспектыву, уменне кіраваць кадрамі і трымаць цесны кантакт з радавымі працаўнікамі неўзабаве далі добры плён.

Гаспадарка вялікая: з поўдня, дзе межавала са Столінскім раёнам, і да паўночнага краю, што ўпіраўся ў Салігорскі, амаль 40 кіламетраў. Але Уладзімір Афанасьевіч летам, устаючы ў 4 гадзіны ранку, да нарады са спецыялістамі паспяваў агледзець усе патрэбныя аб'екты, каб удала спланаваць рабочы дзень.

Адзін з важнейшых поспехаў працоўнага калектыву – дысцыпліна. Для кожнага з людзей свяцілася ласкавая старшынёва ўсмешка, а на парушальнікаў абрыньваўся гнеўны погляд карых вачэй.

Такім паўстане ён у вобразе Уладзіміра Каравая ў п'есе Андрэя Макаёнка "Таблетку пад язык".

## “ПІСАЦЕЛЬ”

Вясной 1960-га года ў цэнтры вёскі Любань быў пабудаваны раскошны драўляны дом, у хуткім часе туды пераехала сям'я

Уладзіміра Афанасьевіча Сцепчанкі На наваселле былі запрошаны сябры і калегі старшыні. Сярод гасцей быў і Андрэй Макаёнак. Тады яго тут яшчэ ніхто не ведаў. Але з таго часу Андрэй Ягоравіч стаў частым старшынёвым госцем. Іх можна было ўбачыць і каля Прыпяці на адпачынку за рыбацкай юшкай, і ў Грычыне, дзе ішла абшырная меліярацыя; Макаёнак іншы раз з'яўляўся ў калгаснай канторы, у клубе, у бібліятэцы.

Я ў той час працаваў у сельскім клубе масавіком і бібліяэкарам, а таксама з'яўляўся нявызваленым сакратаром камсамольскай арганізацыі калгаса. Аднойчы ў бібліятэку зайшоў статны мужчына. Прыгожы твар, прамы нос, у цёмную густую кучму валасоў ёмка ўпісаны плоскі лоб, а з-пад густых броваў глядзелі дапытлівыя вочы. Да гэтага я ўжо разоў тры бачыў яго, казалі "пісацель", але гаварыць з ім не даводзілася.

Праз прызму часу амаль у 50 гадоў канкрэтна не помню, пра што мы гаварылі. Запомнілася адзінае, што я ўдакладніў, якія кнігі ён выдаў, а Андрэй Ягоравіч крыху ўхіліўся ад адказу, сказаў, што ўжо напісана нямала твораў, па яго п'есах ставяцца спектаклі “А раз ёсць творы, будзе і кніга”, запэўніў ён.

**СУСЕДЗІ**

Мінула шэсць гадоў. Пасля заканчэння Пінскага педвучылішча я ўладкаваўся ў Любанскую школу настаўнікам пачатковых класаў. Сталася так, што купіў дом па-суседску са Сцепчанкамі. Па нейкіх бытавых патрэбах іншы раз даводзілася бываць у суседзяў. Бачыў, што ў іх нярэдка былі госці, але самым частым – Макаёнак, які, здаралася, жыў па некалькі дзён запар.

Пра Андрэя Ягоравіча гаварылі, што ў яго нелады з жонкай, але ён шкадуе сына і дачку, таму не разводзіцца.

Жонка Сцепчанкі, Еўдакія Васільеўна, працавала ў школе бібліятэкарам. На пытанні настаунікаў аб становшчы ў сям’і Макаёнка адмоўчвалася. Затое некалькі разоў хваліла:

- Каб вы бачылі, які Андрэй Ягоравіч артыст! Чытае свае п’есы - заслухаешся, жэсты, грымасы так пасуюць да яго выканання! Пагляджу, паслухаю – здаецца, у тэатры пабыла.

## УЗДЫМ

Пад кіраўніцтвам У.А.Сцепчанкі калгас (перайменаваны ў “Новае Палессе”) хутка набіраў тэмпы росту. Асушаныя землі Грычынскага балота давалі самыя высокія ўраджаі ў вобласці; ссяленне калгаснкаў з хутароў у вёскі дало магчымасць сканцэнтраваць рабочую сілу. За кароткі час у гаспадарцы ўмацавалася эканоміка, вырасла матэрыяльна-тэхнічная база, наладзіўся дабрабыт калгаснікаў.

Значную дапамогу аказаў Пётр Міронавіч Машэраў. Сцепчанка і Машэраў пазнаёмілія ў 1957 годзе, тады Уладзімір Афанасьевіч працаваў старшынёй Ленінскага райвыканкама, а Пётр Міронавіч першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ. Летам 1959 г. Машэраў прыязджаў да нас на адпачынак, а ў 1962 г., ужо будучы сакратаром ЦК КПБ, наведаўся з вялікай дэлегацыяй спецыялістаў, каб на аснове асушаных земляў стварыць паказальную гаспадарку. Былі выдзелены значныя сродкі.

З успамінаў Кузьмы Андрэевіча Буневіча, былога галоўнага заатэхніка калгаса “Новае Палессе”:

*“У сярэдзіне 60-х гадоў калгас “Новае Палессе” асноўную апору зрабіў на меліярыраваныя землі: скрозь з’явіліся плантацыі палявых культур і сеяных траў. Высокія ўраджаі і трывалая кармавая база далі магчымасць павялічыць пагалоўе буйной рагатай жывёлы. У кожнай брыгадзе (а іх 6) меліся жывёлагадоўчыя фермы. Аснову пагалоўя складалі каровы палепшаных мясцовых дойных парод і завезеных з Тамбова мяса-малочных сіменталаў.*

*Але яны былі нізкапрадуктыўныя, як па надоях, так і па тлустасці малака. Наспела неабходнасць самым сур’ёзным чынам заняцца паляпшэннем якасці малочнай прадукцыйнасці.*

*Пётр Міронавіч Машэраў на базе нашага калгаса правёў абласны семінар, на які з’явіліся спецыялісты НДІ і міністэрства сельскай гаспадаркі. Былі дэталёва прааналізаваны ўсе аспекты жывёлагадоўлі. У выніку Пётр Міронавіч прыйшоў да вываду: “трэба тэрмінова змяніць пароднасць кароў. У Прыбалтыйскіх рэспубліках не толькі высокія надоі малака, але і высокая тлустасць. Літаральна заўтра выходзім на Літву, закупаем племянных кароў чорна-пярэстай пароды. Вялікую ролю ў*

*павышэнні тлустасці іграюць бабовыя культуры. Яны маюцца на Украіне. Адтуль завязем насенне тых траў”.*

*На нарадзе было вырашана калгасу “Новае Палессе” надаць статус племяннoй гаспадаркі, увесці штат вопытных селекцыянераў і асеменатараў, каб не толькі гадаваць, але і вырошчваць і прадаваць цялушак у іншыя гаспадаркі раёна.*

*Былі выдзелены вялікія грошы, калгас крута пайшоў на ўздым”.*

Дарэчы, машэраўская сістэма пашырэння племяннoй справы спрацавала ўдала. Ужо праз 4 гады “Новае Палессе” мела групы кароў, што дасягалі пяцітысячных надояў малака. На прыкладдзе гэтага калгаса племянныя гаспадаркі былі створаны ва ўсіх раёнах Беларусі.

П.М.Машэраў яшчэ два разы прыязджаў у “Новае Палессе”. Заходзіў на фермы, выязджаў у поле, сустракаўся і гутарыў з калгаснікамі, бачыў рэальную карціну жыцця. Ветлівы, просты, адкрыты – такім і зараз помніцца людзям старэйшага пакалення. Кажуць: “О, то быў чалавек! Усё было па-простаму, і ніякай паказухі, бы цяпер, не было”.

Калгас ішоў на пад’ём. Вёскі добраўпарадкоўваліся, забудоўваліся і электрыфікаваліся новыя вуліцы, будаваліся Дом культуры, праўленне калгаса, стадыён, у кожнай брыгадзе меліся дзіцячыя садкі і лазні.

У 1966 годзе У.А.Сцепчанку было прысвоена ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

## МАКАЁНКАВЫ ДРЭВЫ

1967 год быў юбілейным: набліжалася 50-годдзе Вялікага Кастрычніка. У цэнтры Любані ішло будаўніцтва: узводзіўся прасторны цагляны будынак сельскага Дома культуры, непадалёк размецілі шырокую плошчу пад стадыён. А вакол ДК і стадыёна размяшчалася вялікая пустка. Тут вырашылі пасадзіць дрэвы і парку надаць імя 50-годдзя Кастрычнка.

Было закуплена дзве тысячы штук саджанцаў дрэў і кустоў (з улікам абсадзіць і калгасны двор). Арганізацыю пасадкі даручылі сакратару партарганізацыі калгаса Іларыёну Еўстаф’еву.

На пасадцы былі задзейнічаны паляводы калгаса, вучні школы, клубныя работнікі. Наведаліся сюды і старшыня калгаса з госцем, Андрэем Макаёнкам. Ну, як жа тут не пасадзіш дрэўца!

- Дрэвы – гэта памяць, – зазначыў Сцепчанка.

- На памяць найлепш садзіць дубы. Яны даўгавечныя, – удакладніў Макаёнак.

Але сярод саджанцаў дубкоў знайшлося толькі два. Іх пасадзілі па-суседску, а побач яшчэ па два дрэўцы іншых парод. Праўда, на наступны дзень Еўстаф'еў знайшоў яшчэ два дубкі і пасадзіў іх паблізу.

Прайшлі гады, выраслі дрэвы. Мала хто помніць у вёсцы Андрэя Макаёнка, а дрэвы памяць берагуць.

## НАВАСЕЛЛЕ З "ЛЯВОНІХАЙ НА АРБІЦЕ"

29 жніўня 1969 года ў "Новым Палессі" было святочна: гасцінна расчыніў дзверы новы Дом культуры. Ды к таму ж на адкрыццё прыехаў Купалаўскі тэатр з Мінска. Перад гэтым каляровыя афішы інтрыгавалі вяскоўцаў. Цікавая назва – "Лявоніха на арбіце", цікавыя сцэнічныя фрагменты і сустрэча з аўтарам, знаёмым усім чалавекам – усё гэта прывабіла столькі гледачоў з



*А. Макаёнак з артысткамі БДТ імя Я.Купалы Г.Макаравай і Г.Бальчэўскай*

усіх сваіх і суседскіх вёсак, што, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Вялізная зала не змагла ўмясціць усіх прысутных, і адкрылі заднюю рассоўную сцяну.

І сам змест камедыі, і ўдалая іграа майстроў сцэны П.Малчанава, Л.Рахленкі, У.Кудрэвіча, Г.Макаравай і асабліва Барыса Платонава ў ролі Лявона, а Глеба Глебава ў ролі Максіма настолькі спадабаліся гледачам, што зала бурліла ад эмоцый і апладысментаў. Уявіце, такі тэатр – на вясковай сцэне!

Не меншую пашану меў і Андрэй Ягоравіч Макаёнак.

Праз два гады паказаць любанцам "Трыбунал" купалаўскі калектыў ехаў з вялікай ахвотай. З артыстаў, што ігралі "Лявоніху", была толькі Галіна Макарава. "Трыбунал", як і "Лявоніху на арбіце", народ успрыняў на "ура". Усе захапляліся Генадзем Аўсянікавым, а Галіну Макараву, хоць і мажная, здавалася, гатовы насіць на руках.

## ПОШУКІ ВЫЙСЦЯ

У ранні брэжнеўскі перыяд вёскі Лунінеччыны былі на ўздыме, лідарам жа па тэмпах развіцця яўна з'яўлялася Любань, як і калгас "Новае Палессе". Але на прамысловых прадпрыемствах рабочыя мелі значна большыя заробкі, чым працаўнікі нават передавой сельгасарцелі. Назіралася вялікая ўцечка вяскоўцаў у горад, міграцыя набыла масавы характар.

У хуткім часе Андрэй Макаёнак напіша п'есу "Таблетку пад язык", дзе галоўны герой Уладзімір Каравай, прататып Уладзіміра Сцепчанкі, будзе таміцца ў загадцы.

Каравай (у роздуме):

*І жыць ужо сталі як людзі, і зарабляць. Дык жа не, цягне іх у горад. Чаго ім тут не хапае? Усё ў горад, у горад, у горад...*

А малады калгаснік Іван Швед смела выкажа старшыні:

- *У горадзе можна кожны вечар у цырк хадзіць. Не тое, што тут. У тэатр, у оперу... "Лебядзінае возера" не ў кіно, а ўжывую паглядзець... У горадзе зараз сезон на рабочую сілу, асабліва на будоўлі.*

Дзед Цыбулька ў дыялогу выкажа яшчэ больш слушную думку:

- *Хочаш, каб людзі не ўцякалі – плаці бы ў горадзе...*

Праблема міграцыі вяскоўцаў хвалявала не толькі Ул. Сцепчанку, але і Андрэя Макаёнка, і пісьменнік дасканала захапіўся гэтым пытаннем. Пазней у інтэрв'ю карэспандэнту БелТА У.Рубіну Макаёнак гаварыў пра Сцепчанку: "Я часта ездзіў у яго гаспадарку,

удзельнічаў у планёрках, нарадах, пасяджэннях праўлення. Ёмістыя дэталі, вобразы людзей, якія ўвайшлі ў п'есу "Таблетку пад язык", узяты адтуль" ("Мінская праўда", 12.11.1980).

Пісьменнік быў не толькі назіральнікам, але і дарадцам, натхняльнікам. Творчая Макаёнкава парада не аднойчы выручала Сцепчанку.

"Таблетку пад язык" – гэта своеасаблівы рэпартаж з калгаснай глыбінкі. Усё тое, што асветлена ў ім, – камедыйнае, а рэальнае засталося па-за шырмай тэатраў.

"Тое, аб чым мараць героі маёй п'есы дзед Цыбулька і Швед, ты, Валодзя, можаш зрабіць явай, – раіў Макаёнак – У тваім "Палессі" такі бюджэт! Раўняйся на горад, дружа!"

І Любань сапраўды ўзяла курс на гарадское жыццё. Было пабудавана некалькі шматкватэрных дамоў, праведзены водаправод; футбольная каманда займала лідзіруючыя месцы ў таварыстве "Ураджай" нават у рэспубліцы.

Уладзімір Афанасьевіч Сцепчанка быў натурай неартыстычнай. Але з першых дзён свайго праўлення ў тутэйшай гаспадарцы клубу і культрабоце ўдзяляў не менш клопатаў, чым сельгасвытворчасці. У клубе дзейнічалі вялкі хор, танцавальны калектыў, вакальна-інструментальны ансамбль і духавы аркестр.

З увядзеннем у строй новага Дома культуры пашырыўся дыяпазон культурнага жыцця. Сюды запрашаліся лепшыя калектывы краіны: "Песняры", "Харошкі", хор Г.Цітовічача, капэла Р.Шырмы і нават выяздны цырк (аб чым марыў Іван Швед з камедыі "Таблетку пад язык").

## ПАЗНАВАЛІ САМІ СЯБЕ

Перш, чым паказаць камедыю "Таблетку пад язык" мінскаму гледачу, артысты тэатра імя Янкі Купалы вырашылі правесці, як яны казалі, генеральную рэпетыцыю тут, на радзіме твора.

Зноў, як і на пастаноўцы "Лявоніхі на арбіце" і "Трыбунала", Дом культуры быў перапоўнены людзьмі Усе, ідучы на спектакль, спадзяваліся ўбачыць бытавыя сцэны ці рэальныя дзелавыя факты, а ўбачылі камедыйнае прадстаўленне. Але ў прадстаўленай п'есе прысутныя ў вобразах герояў пазнавалі сябе ці знаёмых. Можна было пачуць нягромкае: "Глядзіце, то ж рыхтык дзед Лукаш" (Лукаш

Шэўчык – вартаўнік канторы), “А во гэта – Валера Лысякоў”, “а то – Фёдар Мірояў”.

Бачылася і адчувалася,  што на сцэне не проста артысты, і не тэатральныя персанажы, народжаныя фантазіяй пісьменніка, і хоць карціны камедыйныя, а героі жыццепадобныя. Ураджвала і мова герояў. Бываючы ў асяродку жыхароў Любані і Лахаўкі, Андрэй Макаёнак занатаваў многія фразы, вывучыў стылістыяныя асаблівасці і дыялектыку народнай гаворкі, таму мова яго персанажаў, каларытная, трапная, пераўвасобленная “па-макаёнкаўску” .

***



*І. Матусевіч у ролі дзеда Цыбулькі*



*В. Шмакаў у ролі Каравая*

З расказаў А. Макаёнка вядома, што яго бацька Ягор, стары бальшавік, арганізатар калектывізацыі, з’яўляўся старшынёй мясцовага калгаса “Прагрэс”. У 1933 годзе на яго жыццё здейсніў замах мацёры бандыт Цыбулька. Бацька быў паранены. А Цыбульку за шматлікія бандыцкія ўчынкі сурова пакаралі.

А Андрэй Макаёнак аднаму з галоўных герояў п’есы “Таблетку пад язык” надаў прозвішча Цыбулька – герой станоўчы, дзелавы. Чаму? На жаль, гэта пытанне  ўзнікла значна пазней, калі Андрэя Ягоравіча ўжо не было ў жывых.

## ГОСЦІ – ВЯДОМЫЯ ПІСЬМЕННІКІ

На розных Макаёнкавых юбілеях ды ўрачыстасцях заўсёды прысутнічаў Уладзімір Афанасьевіч Сцепчанка і амаль пастаянна Іван Пятровіч Шамякін. Іх звязалі не толькі творчыя інтарэсы, але і зямляцтва.На адной з сустрэч і запрасіў Сцепчанка сяброў у госці.

1.

Першы раз Іван Шамякін прыязджаў у Любань з Андрэем Макаёнкам вясной 1967 года.

У Грычыне вяліся пасяўныя работы. Івана Пятровіча, вядома цікавіў не ход работ, а размах асушаных зямель, захапляла карціна пераўтвораных у шырокія роўныя палеткі балот.

У той жа дзень гасцей звазілі да Прыпяці паглядзець на веснавы разліў ракі. Там Іван Пятровіч быў ураджаны “вялікай вадой”: як кінуць вокам, да гарызонта – водная гладзь, з якой тарчаць купы лазы ды рэдкія дрэвы. Убачыўшы такую панараму і праехаўшы на маторнай лодцы па той вадзе, Шамякін успомніў гістарычны факт:

– Можна смела сцвяджаць, што тут было мора Герадота. І расказаў прысутным пра загадку знаходжання таго “мора”.

2.

Летам 1968 года жыты, аўсы ды ячмені на калгасных палетках каласілі буйна – бачыўся найвялікшы ўраджай зерня. Такой радасцю, вядома, Сцепчанка не мог не падзяліцца з Андрэем Макаёнкам і запрасіў яго на “Зажынкі”, і не самога, а з Іванам Шамякіным.

Быў пагодны дзень. Жанчыны сярпамі нажалі сноп жыта, пад жніўныя песні velічалі старшыню калгаса, аграномаў, брыгадзіраў і гасцей – пісьменнікаў. А потым з мехдвара выйшла армада камбайнаў. Такое відовішча ўражвала кожнага, хто быў побач.

У той дзень за святочным сталом у таставых выступленнях і Андрэй Ягоравіч, і Іван Пятровіч не скрывалі сваіх эмоцый.

3.

Недзе ў другой палове сямідзесятых Макаёнак пабудаваў каля Мінска новую дачу. Прыгожы будынак цешыў пісьменніка; там яму добра працавалася, там ён адпачываў душою. Кажуць што, апісваючы дачу аднаго з герояў рамана “Атлантыды і карыятыды”,

Іван Шамякін узяў усе дэталі Макаёнкавай. Там адбылася сустрэча Сцепчанкі з Іванам Шамякіным і Піменам Панчанкам.

Уладзімір Афанасьевіч тады ўжо жыў у Брэсце, працаваў у абласным упраўленні сельскай гаспадаркі, але і ў былым сваім калгасе “Новае Палессе” быў жаданым чалавекам і запрасіў гасцей туды “на рыбу”.

Быў пачатак восені. На панадпрыпяцкіх лугах-сенажацях стаяла безліч стагоў, што вельмі ўразіла Івана Шамякіна, а Панчанка выказаўся, што бачыў такое відовішча каля Петрыкава і выразіў той малюнак у вершы.

Звычайна Івана Шамякіна бачылі ў кампаніі з Андрэем Макаёнкам. Але ў той раз Андрэю Ягоравічу па нейкай прычыне не выпала прыехаць у Любань. Сезон палявання, і Сцепчанка, даверыўшы гасцей былому свайму калгаснаму шафёру Адаму, з двума паляўнічымі адправіўся, як ён казаў, на качак. Адам з Шамякіным і Панчанкам селі ў лодку і там жа, у старыцы Прыпяці, зацягнулі сетку.

З расказу Адама Мікітавіча Шчагрыковіча:

*- У тым рукаве старой Прыпяці было так прыгожа! Жоўтыя гарлачыкі, і белыя лілеі сярод круглых лісцяў-капелюшоў, кучкі сітнягоў у вадзе і цёмна-зялёная асака на беразе між лазнякоў стварaлі такі гожы малюнак, што пісьменнікі свяціліся ад захаплення. Асабліва Панчанка. А калі я паказаў водныя цуды – сальвінію плывучую і вадзяны арэх – уразіўся і Шамякін.*

*Прыемна было глядзець на гэтых мужчын і тады, калі пачалі хажаць сець. Улоў быў небагаты, але відаць было, што рыбы на юшку хопіць аднаго закіду.*

*– Ай шкада, няма тут нашага Андрэя, ён быў бы рады, – казаў Іван Пятровіч, вынімаючы рыбу з ценета. І патлумачыў: – Хто-хто, а Ягоравіч – рыбак заядлы. Ён абавязкова сказаў бы: “А давай яшчэ разок закінем сець”… Тут і далей яшчэ не раз згадвалі Макаёнка добрым словам.*

… Потым быў смачны абед, жарты і смех і гаворка пра жыццё і пра работу. Пімен Панчанка прачытаў некалькі сваіх вершаў. Асабліва хораша ў той атмасферы чытаўся верш “ На Палессі восень”.

*На Палессі восень…*

*Гусі белыя*
*Выскублі мядовую траву,* –

інтанацыйна чытаў аўтар.

*Смех і кветкі,*
*Вы куды падзеліся?*
*Навакол стагі, стагі, стагі.*
*Чым жа ты цяпер са мной падзелішся,*
*Прыпяць, пачарнелая з тугі?*
*………………………………..*
*А сама замкнешся у лядоўні,*
*Лета у стагі паклаўшы спаць...*
*Будуць коні сніць лугі мядовыя*
*І, як людзі, цяжка уздыхаць.*

Хараша, і ўдзячная кампанія падарыла Панчанку апладысменты.

## ЧАРАВАЛА БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

29 лістапада 1970 г. з творчай камандзіроукай, а дакладней, у славутую на той час гаспадарку, як рэкламавалася ў аб'явах, прыехалі госці: Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі і Пятрусь Макаль.

Здавалася, ну якая можа быць цікавасць да паэзіі ў калгасных паляводаў, жывёлаводаў ці будаўнікоў. А менавіта, акрамя школьнікаў і настаўнікаў, залу запоўнілі людзі гэтых катэгорый.

Уважліва слухалі Вярцінскага і Макаля, а Гілевіч дык зачараваў усіх прысутных. Па-першае, у яго рэпертуары пераважалі сатырычныя вершы, што вельмі весялілі публіку, усялялі ажыўленне і смех; па-другое, Ніл Сымонавіч – цудоўны чытальнік; і па-трэцяе, яго чыстая, сакавітая беларуская мова захапляла, паланіла ўсіх. На фоне нашага грубага палескага дыялекту то была чаруючая гаворка, тым і запомніўся ён людзям на доўгія гады.

## РАСКАЗАЦЬ КАМУ ПРА ГЭТА - НЕ ПАВЕРЫЦЬ

Калгас “Новае Палессе” для аднаўлення статку некалькі разоў закупляў племянных кароў і цялушак у Літве. То нашы калгаснікі ездзілі туды, то іхнія везлі сюды.

У той раз прывезла цялушак група літоўцаў. У калгасе іх прынялі вельмі гасцінна, нават на пару дзён адправілі на адпачынак да Прыпяці. Там, у адным з жывапіснейшых месцаў на высокім беразе размяшчаліся пасека і домік пчаляра. Сторажам працаваў Адам Ігнатавіч Шчагрыковіч, чалавек гаманкі і вясёлы; ён быў удалым рыбаком, майстрам зварыць юшку, згатаваць смачную ежу. Таму Сцепчанка даручыў гасцей менавіта яму.

Па дарозе заехалі да Шчагрыковіча дадому. А ў таго сям'я – жонка, сямёра дзяцей (старэйшыя ўжо школу заканчвалі, а меншыя – малалеткі). Адам іншы раз суткамі прападаў на рабоце, таму дома няўпраўка, на двары шмат беспарадку, ды і ў хаце вядома які парадак быў, калі куча дзяцей.

Прыехалі да стану, а там знаходзілія на адпачынку дачка Адама Тамара і госця, шваграва дачка Святлана, як ні дзіўна, з Вільнюса. Пры з'яўленні літоўцаў Святлана ў кантакт з імі не ўвайшла.

Госці выпівалі чарку за чаркай, елі юшку, у вочы хвалілі гаспадара, а размаўляючы між сабой, хаялі Адама і жонку, высмейвалі мнагадзецтва гэтай сям'і, асуджалі бескультур'е нашых вяскоўцаў.

Пляменніца слухала ўсю гэту размову, адклікала дзядзьку ўбок і выклала ўсё, аб чым гаварылася.

- Гэтак? Я іх зараз правучу!

І доўга не думаючы, пайшоў у "атаку".

- То вы што, у вочы добрыя, а завочна паліваеце брудам? Мае дамашнія праблемы – часовыя. Дзеці выраступь – людзьмі стануць. Як вы заўважылі, я ведаю тры мовы (ён да гэтага ўжо размаўляў і па-беларуску, і па-руску, і на польскай мове, бо скончыў тры класы польскай школы), а мае дзеці ўжо зараз, акрамя гэтых трох, ведаюць яшчэ некалькі замежных. Нават літоўскую. Святлана! – паклікаў пляменніцу. – Перакажы, пра што тут гаварылася.

Тая вільнюскім акцэнтам выказала пра пачутае, нават прысаромела гасцей.

Госці былі шакіраваны. У хуткім часе пачалі збірацца ў дарогу, маўляў, там, дома, шмат работы, адпачываць няма калі…

Андрэй Макаёнак, даведаўшыся пра гэты выпадак, казаў:

- Ай, маладзец, Ігнатавіч! Не зганьбіў нацыянальны гонар. Адваяваў чэсць і сям'і, і грамадства. Расказаць каму пра гэта – не паверыць.

Але пазней фрагменты той гутаркі літоўцаў пра мнагадзетнасць А.Макаёнак увасобіў у дыялогах нямецкага каменданта з Цярэшкам Калабком у трагікамедыі “Трыбунал”.

## ДЗЯРЖАЎНЫ АЎРАЛ

1979 год. Сухое лета. Павыгаралі ўсе пасевы, сеяныя травы. Так было па ўсёй Беларусі. Узнікла пагроза кормавытворчасці, зімовай бяскорміцы грамадскага і падсобнага пагалоўя буйной рагатай жывёлы. А таму Пётр Міронавіч Машэраў на ўзроўні ўсёй рэспублікі ўзняў пытанне аб нарыхтоўцы кармоў.

Свой вялікі неспакой Пётр Міронавіч выразіў і ў тэлефоннай размове са Сцепчанкам, які працаваў у той час дырэктарам Брэсцкага абласнога трэста “Нарыхтоўжывёлакарм”. Уладзімір Афанасьевіч падказаў ідэю нарыхтоўкі кармоў на Палессі, дзе ў пойме Прыпяці маецца велічайшы запас дзікарастучых траў на невыкарыстаных угоддзях. Ва ўсе раёны Брэсцкай і Гомельскай абласцей былі накіраваны тэлеграмы з заклікам актывізаваць работу па нарыхтоўцы корму жывёле.



*П.М. Машэраў сярод партактыву Брэсцкай вобласці (чацвёрты злева ў трэцім радзе). На пярэднім плане ў цэнтры – У.А. Сцепчанка*

З успамінаў былога галоўнага агранома калгаса “Новае Палессе” Аляксея Фёдаравіча Антановіча:

*– Заклік Машэрава быў успрыняты як аўрал. На нарыхтоўку сена і зялёнай масы для сіласу ўключыліся літаральна*

*ўсе калгаснікі, а таксама многія рабочыя і служачыя ўсіх арганізацый раёна і нават вучні старэйшых класаў усіх школ. Выкошвалі кожны няскошаны лапік зямлі, нават пустазелле на пустырах.*

*У разгар корманарыхтоўчых работ на верталёце з'явіўся Машэраў. У гумавых ботах, у простай вопратцы. Дарэчы, ён не апавяшчаў зарань мясцовае кіраўніцтва, не вёз з сабой світу чыноўнікаў і кучу журналістаў. Вітаўся з людзьмі (з некаторымі за руку), гутарыў з паляводамі, з механізатарамі і іншымі. Спачатку наведаў угоддзі калгаса "40 гадоў Кастрычніка" (Сінкевічы), потым – "Новае Палессе" (Любань). Ведаючы ўсю абстаноўку спраў і настрой людзей, тады ўжо вёў гутарку са старшынямі калгасаў і іншымі кіраўнікамі.*

Адказнымі за выкананне планаў нарыхтоўкі кармоў для жывёлы па Брэсцкай вобласці быў назначаны Сцепчанка. Ні на дзень не пакідалі яго дзяржаўныя клопаты. Апошнія летнія месяцы і пачатак восені Уладзімір Афанасьевіч правёў у частых паездках па раёнах. Некалькі разоў наведваў Лунінеччыну, не мінаў і Любань.

У канцы верасня Сцепчанка завітаў сюды з Андрэем Макаёнкам. Відаць сябры прыязджалі сюды, каб адпачыць, прабыванне іх было з паляваннем, рыбалкай. Начавалі каля Прыпяці, у так званай, "Сцепчанкавай хаце". Кампанія была вузкага кола. І той прыезд стаўся мала прыкметным для людскіх вачэй.

Мінуў час. Як ужо бачна цяпер, тое прабыванне Макаёнка ў нашых мясцінах было апошнім. У 1982 годзе Андрэя Ягоравіча не стала.

## ПАСЛЯСЛОЎЕ

Даўно няма ў жывых Андрэя Макаёнка, больш за дзесяць гадоў, як пайшоў з жыцця Уладзімір Сцепчанка, і паступова з прыходам новых пакаленняў згасае народная памяць аб гэтых вядомых у свой час людзях.

Зараз СВК "Новае Палессе" знаходзщца ў цяжкім становішчы. А вось вёску Любань, якая таксама некаторы час была ва ўпадку, дзякуючы дзяржаўнай праграме, аднавілі: набылі новае аблічча школа, паштовае аддзяленне, гандлёвы цэнтр, фельчарска-

акушэрскі пункт, камбінат бытавога абслугоўвання – вёска набыла статус аграгарадка.

Значна змяніўся Дом культуры з сельскай бібліятэкай. І, як візітная картка, каля параднага ўваходу будынка – мемарыяльная дошка, якая сведчыць аб добрых справах сяброў-таварышаў – старшыні калгаса і пісьменніка. Дошка адкрыта 15 верасня 1996 года. У цырымоніі адкрыцця прыняў удзел сын А.Макаёнка Сяргей. На дошцы – здымкі У.А.Сцепчанкі і А.Я.Макаёнка і тэкст: “У перыяд з 1959 па 1974 гады Любань і наваколле неаднаразова наведваў славуты драматург, народны пісьменнік Беларусі Андрэй Ягоравіч Макаёнак. Прататыпам галоўнага героя яго п’есы “Таблетку пад язык” стаў тагачасны старшыня калгаса “Новае Палессе” Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Апанасавіч Сцепчанка”.

Цэнтральная вуліца Любані носіць імя Уладзіміра Сцепчанкі, а на адной з сесій Лахвенскага сельскага Савета вырашана ўвекавечыць памяць Андрэя Макаёнка: пры забудове новай вуліцы ў вёсцы назваць яе іменем славутага пісьменніка.

## ЗМЕСТ

Сцежкі дзяцінства 3
У пекле вайны 4
На працоўным фронце 5
Герой працы – герой п’есы 5
“Пісацель” 5
Уздым 6
Макаёнкавы дрэвы 7
Наваселле з “Лявоніхай на арбіце” 8
Пошукі выйсця 9
Пазнавалі самі сябе 10
Госці – вядомыя пісьменнікі 11
Чаравала беларускае слова 13
Расказаць каму пра гэта – не паверыць 15
Дзяржаўны аўрал 17
Пасляслоўе 18



**ЛУНІНЕЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА**

Выданне падрыхтавана аддзелам бібліятэчнага маркетынгу
Наклад 50 асобнікаў
Рэдакцыя Т.Карпуковіч
Выдаецца на правах унутранага карыстання